**ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА**

**на дысертацыю ПАЛТАРЖЫЦКАЙ Надзеі Мікалаеўны**
**«Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.**

***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасцям і галіне навукі, па якім яна прадстаўлена да абароны.*** Дысертацыя Н.М. Палтаржыцкай «Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада» адпавядае заяўленай галіне навукі і спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

***Актуальнасць тэмы дысертацыі*** абумоўлена прынцыповай і няспыннай патрэбай пашырэння кола даставерных гістарычных крыніц айчыннай гісторыі, асабліва тых, што суадносяцца з актуальнымі тэмамі гістарычнага даследавання, да якіх адносіцца надзённая тэма арганізацыі і дзейнасці мясцовага самакіравання.

***Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, палажэнняў, якія выносяцца на абарону*** вызначаецца тым, што прадстаўленая дысертацыя з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі крыніцазнаўчым даследаваннем актавых кніг Менскага магістрата – органа самакіравання горада Мінска перыяду Новага часу (на той час – Менск), і адной з нешматлікіх навуковых распрацовак па вывучэнню магістрацкіх актавых кніг у краіне. Аўтарам упершыню здзейснена руплівая архіўная праца па выяўленню і камплектаванню дакументаў са складу актавых кніг Менскага магістрата, вынікам чаго стала фарміраванне крыніцавага зводу другой паловы XVII ст. у складзе двух кніг – кнігі пратаколаў за 1674–1680 гг., і кнігі запісаў (спраў вячыстых) за 1663–1680 гг. (у двух частках).

Такім чынам, аўтарам уведзены ў навуковы зварот новыя пісьмовыя крыніцы, на сёняшні дзень – найдаўнейшыя актавыя кнігі Менскага магістрата, і адпаведна – асабліва каштоўныя крыніцы па гісторыі мясцовага гарадскога самакіравання (заключны перыяд 300-гадовага дзеяння Магдэбургскага права на тэрыторыі Беларусі).

Аўтар упершыню здейсніў паўнаважкую характарыстыку зместу згаданых актавых кніг Менскага магістрата, ацаніў іх верагоднасць і дастаўернасць, выканаў іх разгорнуты крыніцазнаўчы аналіз.

На падставе праведзенага аналітычнага даследавання аўтар абгрунтавана сфармуляваў 4 палажэнні, якія выносяцца на абарону, і прадметна раскрываюць змест і значнасць праведзенай крыніцазнаўчай работы, іх навуковую навізну.

***Абгрунтаванасць і даставернасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі*** вызначаецца паслядоўным, дакладным навуковым падыходам аўтара, заснаваным на традыцыйных, апрабіраваных прынцыпах і метадах гістарычнага даследавання, з неабходнай аўтарскай адаптацыяй. У тым ліку, ужыванне шэрагу спецыяльных метадаў дапаможных гістарычных дысцыплін дазволілі аўтару дасканала ўстанавіць верагоднасць і даставернасць разгледжаных дакументаў.

Крыніцы, якія прыцягнуты аўтарам да разгляду, надзейна атрыбуціраваныя і верыфікаваныя. Высновы даследчыка гістарыяграфічна і крыніцава абгрунтаваныя, і паўнаважка аргументуюцца тэкстам працы. Рэкамендацыі аўтара, як у навуковым, так і ў практычным кірунках, грунтуюцца да дакладнай крыніцавай аснове. Несумненна, здзейсненая Н.М. Палтаржыцкай характарыстыка новай групы гістарычных крыніц, актавых кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст., з'яўляецца значным унёскам у навуку.

***Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі.*** Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі абумоўлена markdownзнабаковым зместам, дакладнасцю і тэматычнай канцэнтрацыяй звестак новых гістарычных крыніц, распрацаваных аўтарам. Тыя звесткі ўяўляюць першачарговую каштоўнасць для вывучэння праблематыкі гарадскога самакіравання, і больш шырока – для гістарычна абгрунтаванай рэканструкцыі жыццядзейнасці горада перыяду Новага часу.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыі ўвасабляецца ў тым, што ўведзеныя аўтарам у навуковы зварот гістарычныя крыніцы маюць комплексны тэматычны змест, прадстаўляюць новыя каштоўныя гістарычныя матэрыялы, вартыя для ўжывання ў галінах гістарычных навук, у т.л. у айчыннай гісторыі, этналогіі, гістарычнай геаграфіі, гістарычнай эканоміцы, гісторыі права, а таксама ў генеалогіі, лінгвістыцы і інш. Таксама, матэрыялы і высновы аўтара вартыя адлюстравання ў навуковых публікацыях, бібліяграфічных даведніках, падручніках і вучэбных дапаможніках па крыніцазнаўству, сацыяльна-палітычнай гісторыі гарадоў, для выканання работ па музеефікацыі элементаў гарадскога ландшафту, для складання турыстычных экскурсійных маршрутаў.

Сацыяльная значнасць вынікаў даследавання: выяўленыя аўтарам матэрыялы карысныя для ўжывання падчас генеалагічных пошукаў, удакладнення пытанняў маёмаснай уласнасці і землеўладання, для ўжывання ў культуралагічных распрацоўках.

Эканамічная значнасць вынікаў дысертацыі: матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаныя падчас падрыхтоўкі сцэнарыяў і правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў, нацыянальных і міжнародных навукова-практычных праектаў.

***Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.*** Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі апрабіраваны аўтарам падчас дакладаў на 16 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях. Крыніцавы матэрыял, вынікі аналітычных даследаванняў і палажэнні, якія выносяцца на абарону выкладзены саіскальнікам у 16 аўтарскіх навуковых публікацыях (без сааўтараў), сярод якіх 5 артыкулаў у навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь.

***Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.*** Дысертацыя аформлена ў адной кнізе, згодна патрабаванням, якія прад'яўляюцца ВАК Рэспублікі Беларусь, і складаецца са спіса скарачэнняў; уводзін; агульнай характарыстыкі працы; 5 глаў, уключаючы структурны падзел на падпункты, з кароткімі высновамі ў канцы кожнай главы; заключэння, уключаючы рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў даследавання; спіса выкарыстаных крыніц і бібліяграфічнага спіса, спіса публікацый саіскальніка; 10 дадаткаў.

Тэксты дысертацыі і аўтарэферата выкладзены нарматыўнай беларускай мовай, у адпаведнасці з патрабаваннямі Інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь па афармленню дысертацыі і аўтарэферата. Аўтарэферат цалкам адпавядае зместу дысертацыі, адлюстроўвае яе структуру, логіку разважанняў і аргументацыю аўтара, уключае вывады і палажэнні, якія выносяцца на абарону.

***Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.*** Аналіз зместу дысертацыі Н.М. Палтаржыцкай, сукупнасці навуковых і практычных вынікаў работы сведчыць аб высокай навуковай кваліфікацыі аўтара.

Дысертацыя адпавядае дзейнічаючаму Палажэнню ВАК Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні вучоных ступеняў. Узровень навуковай падрыхтоўкі Н.М. Палтаржыцкай адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук і заяўленай спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

***Недахопы і заўвагі па дысертацыі.*** Выкладанне матэрыялу дысертацыі паслядоўнае, стуктурна прадуманае. Аргументацыя навуковых палажэнняў, саіскальніка, іх дакладнасць і доказнасць. не выклікае супярэчнасцей.

Побач з тым, маюць месца некаторыя заўвагі па тэксту дысертацыйнай работы:

-ва ўводзінах да аўтарэферата (С. 3) і дысертацыі (С. 5) мае месца пэўная тэрміналагічная адарванасць: менавіта, у першым абзацы зварот "апрацоўка крыніц", напэўна варты ўдакладнення "гістарычных крыніц", і таксама зварот "сучаснай беларускай навукі" – "сучаснай беларускай гістарычнай навукі"; і далей – С. 4 аўтарэферата і С. 6 дысертацыі, зварот "вывучэння крыніц органаў" варта ўдакладніць як "вывучэння крыніц гісторыі органаў"; тое ж у разделе "Навуковая навізна" (С. 5 аўтарэферата і С. 8 дысертацыі) – выраз "кніг... як крыніц" варта ўдакладніць у "кніг... як гістарычных крыніц";

-у пераліку задач даследавання магчыма дыскутаваць іх парадак (менавіта, 1 і 2 задачы), паколькі, па факце, у працы, аўтар першачаргова абмяркоўвае змест 2 задачы;

-у гістарыяграфічным аглядзе па тэме даследавання аўтар не зрабіў лагічны, як бачыцца, уступ аб ролі Магдэбургскага права ў развіцці гарадскога самакіравання;

аўтар не акрэсліў прынцыпы вылучэння межаў прадмета даследавання, напрыклад – ім да разгляду прымаюцца кнігі "беларускіх гарадоў" (С. 9 аўтарэферата і С. 13 дысертацыі), але не удакладняецца, "беларускіх" у этнічным сэнсе (па пераважнай колькасці жыхароў), ці ў сэнсе сацыяльна-палітычным (па знаходжанню на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь);

далей, не вызначаны прынцыпы вылучэння даследчых колаў па праблеме, хаця з кантэксту вынікае, што гаворка ідзе пра даследчыкаў гісторыі Рэчы Паспалітай; далей, у прыватнасці, з агляду не зразумела, ці выконвалі падобныя даследаванні навукоўцы Расіі, таксама як і Латвіі, Эстоніі;

нарэшце, з пункту гледжання метадалогіі даследаванняў магістрацкіх кніг маглі быць вартыя ўвагі работы навукоўцаў Германіі, але яны ў аглядзе не згадваюцца;

У якасці пажадання магчыма было б прапанаваць аўтару ўвесці дадатак з тэрміналагічным слоўнікам, бо гэта таксама каштоўная крыніца па гісторыі права.

У цэлым, безумоўна, адзначаецца агульнае станоўчае ўражанне ад абмеркаванай дысертацыі. Прыведзеныя заўвагі не носяць прынцыповага характару, не ставяць пад сумненне саму дысертацыю, і могуць быць ўлічаныя саіскальнікам у далейшым.

***Высновы.*** У выніку, на падставе выкладзенага, магчыма засведчыць, што разгледжанае дысертацыйнае даследаванне Н.М. Палтаржыцкай «Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада» з'яўляецца паўнавартаснай, самастойна выкананай кваліфікацыйнай навуковай працай, якая прадстаўляе новыя крыніцы, матэрыялы і высновы ў нязменна актуальным навуковым кірунку крыніцазнаўства, а таксама па надзённай праблеме арганізацыі і дзейнасці гарадскога самакіравання.

Дысертацыя змяшчае навуковую характарыстыку новага корпуса крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання – актавых кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст. Згаданыя крыніцы раскрываюць, якім чынам забяспечвалася ў Новы час самакіраванне горада, адлюстроўваюць змест і выніковасць тых працэсаў, характарызуюць іх удзельнікаў.

У цэлым, прадстаўленая дысертацыйная праца Н.М. Палтаржыцкай адпавядае патрабаванням ВАК РБ, якія прад'яўляюцца да дысертацыйных работ на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Магчыма зрабіць выснову, што разгледжаная праца можа быць прынята ў якасці кандыдатскай дысертацыі, а яе аўтар, Надзея Мікалаеўна Палтаржыцкая, у адпаведнасці з п. 20 Палажэння ВАК РБ аб прысуджэнні вучоных ступеняў, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за новыя навуковыя і практычныя вынікі, у тым ліку за:

- вылучэнне і ўвядзеннне ў навуковы зварот новага корпуса крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання – актавых кніг Менскага магістрата другой паловы XVII ст., уключаючы кнігу пратаколаў за 1674–1680 гг. (пратаколы штотыднёвых спраў на 156 аркушах), і кнігу запісаў (спраў вячыстых) за 1663–1680 гг. (у двух частках, уключаюць 541 дакумент);

- комплексную ацэнку паўнаты, верагоднасці і даставернасці вылучаных гістарычных крыніц, уключаючы фіксацыю падробленых у гістарычны перыяд дакументаў;

- шматбаковую тэматычную характарыстыку формы, зместу, асаблівасцей стварэння і захоўвання, функцыянальнай прыналежнасці даследаваных магістрацкіх кніг;

- крыніцазнаўчую ацэнку ступені інфарматыўнасці магістрацкіх кніг Менска ў рэчышчы характарыстыкі структуры і дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Менска другой паловы XVII ст.

Афіцыйны апанент,
намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце
ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі”,
доктар гістарычных навук С.П. Віцязь

6 чэрвеня 2023 г.

Подпіс
СВЕДЧУ
Вядучы спецыяліст па кадрах